# Універсальны перыядычны агляд
## Сумесная справаздача БНМС “РАДА” і Еўрапейскага Моладзевага Форума
## Радзе па правах чалавека ААН

Гэтая сумесная справаздача для 4-га цыкла Універсальнага перыядычнага агляду Беларусі падрыхтавана **Беларускім нацыянальным моладзевым саветам “РАДА”** пры істотным удзеле яго сяброўскіх арганізацый: **Задзіночанне беларускіх студэнтаў, “Экадом”, “Моладзевы блок”, “Маладая Грамада”**; і **Еўрапейскім Моладзевым Форумам**.

Справаздача змяшчае агляд выканання Беларуссю сваіх абавязальніцтваў у сферы правоў чалавека, з акцэнтам на становішча моладзі. У дакуменце таксама выкладзены рэкамендацыі, якія вызначаюць магчымыя дзеянні па вырашэнні згаданых праблемных пытанняў.

**Інфармацыя пра арганізацыі**

**Беларускі нацыянальны моладзевы савет “РАДА”** – добраахвотнае аб’яднанне 44 моладзевых арганізацый, створанае з мэтай кансалідацыі моладзевых ініцыятыў у Беларусі. “РАДА” ажыццяўляе дзейнасць у сферах прадстаўлення, прасоўвання і абароны агульных інтарэсаў і свабод моладзевых арганізацый і маладых людзей у Беларусі.

Вэб-сайт: https://rada.fm/

**Еўрапейскі Моладзевы Форум** – платформа моладзевых арганізацый Еўропы. Аб’ядноўвае больш за 100 арганізацый, якія прадстаўляюць дзясяткі мільёнаў маладых людзей па ўсёй Еўропе.

Вэб-сайт: www.youthforum.org

**Ключавыя словы:** правы моладзі, права на адукацыю, свабода сходаў, палітычны ўдзел, правы ЛГБТКІ+, грамадзянская супольнасць, свабода ад катаванняў, культурныя правы, права на справядлівы суд.

## АГУЛЬНЫЯ ЗАЎВАГІ

1. Некаторыя парушэнні правоў чалавека, адзначаныя ў дадзенай справаздачы, маюць складаны і ўзаемазвязаны характар, і адначасова закранаюць некалькі правоў. Хаця гэтыя праблемы класіфікуюцца па асобных раздзелах, у тэксце згадваюцца і іх шырэйшыя наступствы для іншых правоў, калі гэта дарэчы.
2. У дадзенай справаздачы становішча ў Беларусі аналізуецца на падставе міжнародных дамоваў, да якіх дзяржава далучылася, у прыватнасці: Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Канвенцыі ЮНЕСКА аб барацьбе з дыскрымінацыяй у галіне адукацыі, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, Канвенцыі аб правах людзей з інваліднасцю.

## СІТУАЦЫЯ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

3. Парушэнні правоў чалавека з боку ўладаў Беларусі носяць сістэмны характар з 1996 года, аднак за апошнія пяць гадоў, пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, краіна сутыкнулася з беспрэцэдэнтным і жорсткім узмацненнем рэпрэсій. Дзяржава ўзмацніла рэпрэсіўныя меры, накіраваныя супраць грамадзянскай супольнасці, актывістаў_ак, журналістаў_ак і моладзі. Асноўныя свабоды, у тым ліку свабода выказвання меркаванняў і свабода сходаў, сістэматычна парушаюцца. Маладыя людзі падвяргаюцца арыштам, звальненням з працы, адлічэнню з навучальных установаў і сістэматычнай дыскрымінацыі. Станам на 22 студзеня 2025 года, сярод 1254 палітычных зняволеных па меншай меры 331 чалавек – маладыя палітычныя зняволеныя[1], а 838 – былыя зняволеныя, народжаныя ў 1990 годзе або пазней[2]. У дачыненні да маладых людзей было распачата не менш за 1748 крымінальных спраў[3]. Гэтыя дзеянні з'яўляюцца

---

[1] Праваабарончы цэнтр «Вясна», Спіс палітычных зняволеных, Былыя палітычныя зняволеныя і асобы, асуджаныя па палітычных крымінальных справах, [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://prisoners.spring96.org/en/list?view=1&birthday_from=01.01.1990 Дата доступу: 22.01.2025. У гэты спіс уключаны толькі тыя людзі, чый узрост і асоба вядомыя «Вясне», што азначае, што фактычная колькасць маладых людзей, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, можа быць значна вышэйшай.

[2] Праваабарончы цэнтр «Вясна», Спіс палітычных зняволеных, былых палітычных зняволеных і асоб, асуджаных па палітычных крымінальных справах, [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://prisoners.spring96.org/en/list?view=1&status[]=1&birthday_from=01.01.1990 Дата доступу: 12.01.2025. У гэты спіс уключаны толькі тыя людзі, чый узрост і асоба вядомыя «Вясне», што азначае, што фактычная колькасць маладых людзей, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, можа быць значна вышэйшай.

[3] Праваабарончы цэнтр «Вясна», Спіс палітычных зняволеных, былых палітычных зняволеных і асоб, асуджаных па палітычных крымінальных справах, [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://prisoners.spring96.org/en/list?view=1&birthday_from=01.01.1990 Дата доступу: 12.01.2025. У спіс уключаны толькі тыя людзі, узрост і асоба якіх вядомыя «Вясне», што азначае, што фактычная колькасць маладых людзей, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, можа быць значна большай.

грубым парушэннем міжнародных абавязальніцтваў Беларусі ў сферы правоў чалавека і Канстытуцыі краіны, падрываюць вяршэнства права і дэмакратычныя прынцыпы.

4. У жніўні 2022 года Беларусь выйшла з Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Гэта рашэнне ўступіла ў сілу 8 лютага 2023 года і пазбавіла беларусаў, чые правы не забяспечваюцца дзяржавай, магчымасці падаваць скаргі ў Камітэт па правах чалавека ААН. Гэта быў адзін з нешматлікіх механізмаў міжнароднай абароны правоў беларусаў_ак, а таксама адзіны механізм для абароны ад катаванняў або жорсткага, нечалавечага ці зневажальнага абыходжання ці пакарання.

## ПРАВА НА АДУКАЦЫЮ

5. Моладзь у Беларусі сутыкаецца з істотнымі перашкодамі пры рэалізацыі свайго права на адукацыю, якое цесна звязана з парушэннямі іншых правоў, уключаючы свабоду выказвання меркавання, свабоду сходаў, свабоду аб’яднанняў, права на роўнасць і недапушчэнне дыскрымінацыі, а таксама права на выбар мовы навучання.
6. У сферы вышэйшай адукацыі ўзмацнілася ідэалагічная апрацоўка моладзі, змест адукацыі і пазакласныя мерапрыемствы адлюстроўваюць палітызаваны і варожы парадак дня. Акрамя таго, у шэрагу ВНУ на пасады прарэктараў па бяспецы прызначаюцца супрацоўнікі_цы органаў дзяржаўнай бяспекі (КДБ), якія сочаць за паводзінамі студэнтаў_ак і выкладчыкаў_ц, выяўляюць асоб, што лічацца нелаяльнымі, і ўжываюць ідэалагічны кантроль. Тыя, хто прызнаны нелаяльнымі, падвяргаюцца адлічэнню і звальненням, іншыя – вымушаныя да самацэнзуры і палітычнай канформнасці, каб пазбегнуць наступстваў. Гэтыя практыкі падрываюць ролю адукацыі ў фарміраванні талерантнасці і павагі да правоў чалавека, пра што гаворыцца ў Артыкуле 13 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах.
7. Правядзенне дэманстрацый у навучальных установах фактычна забаронена. У выніку нацыянальнай забастоўкі 26 кастрычніка 2020 года студэнты_кі, якія ў ёй удзельнічалі, падвергліся пераследу, уключаючы арышты, запалохванні і адлічэнні з ВНУ[4]. Гэтыя дзеянні парушаюць абавязальніцтвы Беларусі па Артыкуле 21 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які гарантуе права на мірныя сходы.
8. Свабода аб’яднанняў строга абмежаваная: студэнцкія арганізацыі знаходзяцца пад пастаянным наглядам і рызыкай пераследу[5]. “Задзіночанне беларускіх

---

[4] Задзіночанне беларускіх студэнтаў. (2021, 26 лютага). Справаздача ЗБС аб акадэмічных пратэстах і рэпрэсіях у Беларусі. Еўрапейскі студэнцкі саюз. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://esu-online.org/publications/bsa-report-on-academic-protests-and-repression-in-belarus/ Дата доступу: 22.03.2025.

[5] Задзіночанне беларускіх студэнтаў. (2024, 14 лютага). Справаздача Задзіночання беларускіх студэнтаў: Стан акадэмічнай супольнасці ў Беларусі ў 2023 годзе. Еўрапейскі студэнцкі саюз. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://esu-online.org/belarusian-students-association-report-the-state-of-academia-in-belarus-2023/ Дата доступу: 22.03.2025.

студэнтаў” было прызнана экстрэмісцкай арганізацыяй. У той жа час студэнтаў_ак прымушаюць уступаць у праўладныя моладзевыя структуры, якія ўлады выкарыстоўваюць для дэманстрацыі падтрымкі і ў прапагандысцкіх мэтах. Такія дзеянні парушаюць свабоду аб’яднанняў, прадугледжаную Артыкулам 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

9. У сферы вышэйшай адукацыі захоўваецца гендарная дыскрымінацыя праз нераўнамерныя квоты, якія аддаюць перавагу мужчынам пры паступленні ў ваенныя, міліцэйскія ВНУ, ВНУ па надзвычайных сітуацыях, а таксама пры размеркаванні ў медыцынскія інтэрнатуры. Гэтыя практыкі парушаюць Артыкул 11 Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і супярэчаць Артыкулу 13 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, які забяспечвае роўны доступ да адукацыі.
10. Вышэйшая адукацыя застаецца недаступнай для асоб з інваліднасцю ў дастатковай ступені, асабліва што датычыцца фізічнай інфраструктуры і сродкаў камунікацыі. Сучасныя тэхналогіі падтрымкі, якія садзейнічаюць навучанню, мала даступныя. Паступленне ў ВНУ для асоб з інваліднасцю залежыць ад станоўчага заключэння МРЭК (Медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі), якое часта выносіцца на падставе тэарэтычных прагнозаў адносна магчымасці працаўладкавання. Такі падыход парушае Канвенцыю аб правах інвалідаў, асабліва Артыкул 24, які гарантуе інклюзіўную і недыскрымінацыйную вышэйшую адукацыю.
11. У Беларусі няма ніводнай ВНУ, дзе можна атрымаць поўную адукацыю па-беларуску па якой-небудзь спецыяльнасці. У той жа час такія магчымасці маюць англамоўныя студэнты_кі. У 2024 годзе каля 20% выпускнікоў_ц выбралі здачу экзаменаў на беларускай мове замест рускай. Такая сітуацыя ў сферы вышэйшай адукацыі стымулюе выбар для дзяцей рускамоўных школ або навучанне на замежных мовах, што яшчэ больш маргіналізуе беларускую мову ў адукацыйным кантэксце.

**Рэкамендацыі:**

- Выключыць супрацоўнікаў_іц спецслужбаў з адміністрацыйных пасад у ВНУ для забеспячэння палітычнай нейтральнасці і незалежнасці адукацыі.
- Забяспечыць правы студэнтаў_ак на мірныя сходы і свабоду аб’яднанняў, скасаваўшы забарону на дэманстрацыі ва ўстановах адукацыі, спыніўшы палітычны пераслед студэнтаў_ак і прымус да ўдзелу ў праўладных арганізацыях.
- Забяспечыць поўную даступнасць вышэйшай адукацыі для асоб з інваліднасцю праз паляпшэнне інфраструктуры, пашырэнне камунікатыўнай падтрымкі і павелічэнне наяўнасці сучасных тэхналогій.
- Скасаваць дыскрымінацыйныя квоты пры паступленні ў ВНУ і размеркаванні ў медыцынскія інтэрнатуры, гарантуючы роўны доступ да адукацыі незалежна ад полу, на падставе заслуг і здольнасцей.
- Забяспечыць роўныя магчымасці атрымання вышэйшай адукацыі на беларускай мове.

## ПРАВА НА РОЎНАСЦЬ І НЕДАПУШЧЭННЕ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

*Рэкамендацыі, прынятыя падчас 3-га цыкла УПА: 138.20, 138.236, 138.242, 138.246, 138.247, 138.248, 138.249, 138.250, 138.251, 138.259, 138.69, 138.70, 138.71*

12. У 2024 годзе больш за 30 прадстаўнікоў_ц ЛГБТК+ супольнасці былі затрыманы па сфабрыкаваных абвінавачваннях. Большасць з іх былі памылкова абвінавачаныя ў адміністрацыйных правапарушэннях. Артыкулы аб "хуліганстве" і артыкул 368 (пра "распаўсюджванне парнаграфіі") выкарыстоўваліся для пераследу ЛГБТК+ асобаў, асабліва трансгендарных людзей. Затрыманні суправаджаліся катаваннямі з боку праваахоўных органаў, што парушае абавязальніцтвы Беларусі па Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах.
13. Міністэрства культуры ўнесла змены[6] ў рэгуляванне "эратычных матэрыялаў", прыраўняўшы "гомасексуальнасць, лесбійскае каханне" і "жаданне жыць і ўспрымацца як асоба супрацьлеглага полу" да "нетрадыцыйных палавых адносін і (або) паводзінаў". Такая класіфікацыя ставіць адносіны ЛГБТК+ у адзін шэраг з некрафіліяй, педафіліяй і вуайерызмам, што фактычна паталагізуе іх і ўмацоўвае дзяржаўную дыскрымінацыю. Паводле дзеючага заканадаўства, "дэманстрацыя" такіх адносін можа разглядацца як парнаграфія. Публічны распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў караецца да чатырох гадоў пазбаўлення волі, а калі ў іх фігуруюць непаўналетнія – да трынаццаці гадоў. Такая расплывістая і шырокая трактоўка закону стварае сур'ёзную пагрозу крымінальнага пераследу за любы паказ ЛГБТК+ ідэнтычнасці ў публічнай прасторы, СМІ ці культуры.[7]
14. Паводле справаздач, у 2023–2024 гадах у 80% выпадкаў[8] камісіі адмаўлялі трансгендарным асобам у змене дакументаў, што парушае іх права на медыцынскія паслугі. Для параўнання, у 2019–2022 гадах паказчык адмоў вагаўся ад 0% да 20%.
15. У 2024 годзе Генеральная пракуратура падрыхтавала законапраект, які прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць за "прапаганду нетрадыцыйных адносін, бяздзетнага ладу жыцця і педафіліі".
16. Беларусь не здзяйсняе неабходных крокаў для ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, як гэта прадугледжана Канвенцыяй аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. У краіне дагэтуль адсутнічае закон, які забараняе ўсе формы гвалту ў дачыненні да жанчын, уключаючы гвалт у сям'і. Статыстыка па хатнім гвалце цяжкадаступная,

[6] База даных ILGA. (2024). Рашэнне № 24 (2024). [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://database.ilga.org/api/downloader/download/1/BY%20-%20EXE%20-%20Decision%20No%2024%20(2024)%20-%20OR-OFF%20(ru).pdf. Дата доступу: 22.03.2025.

[7] Беларусь называе жыццё ЛГБТ «порнаграфіяй» [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.hrw.org/news/2024/04/12/belarus-calls-lgbt-lives-pornography Дата доступу: 20.01.2025.

[8] У верасні 2023 года на камісіі з 20 удзельнікаў станоўчыя рашэнні былі прыняты толькі для 4 чалавек (20%), а 16 атрымалі адмову (80%) [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://tbelarus.com/post/monitoring-komissii-po-trans-perehodu-v-belarusi-2019-2024?utm_source=chatgpt.com Дата доступу: 20.01.2025.

афіцыйная справаздачнасць недастатковая, а доступ да даных абмежаваны. Паводле даных,[9] толькі ў 2022 годзе ад хатняга гвалту пацярпелі больш за 70000 чалавек. Акрамя таго, прымусовая ліквідацыя больш за 1600 НДА[10], у тым ліку тых, што займаліся абаронай правоў жанчын і дапамогай пацярпелым ад гвалту, прывяла да знікнення магчымасцяў падтрымкі ахвяраў. Крыміналізацыя супрацоўніцтва з арганізацыямі ў выгнанні яшчэ больш ускладніла збор статыстыкі па праблеме гендарнага і хатняга гвалту.

17. Хаця спіс забароненых прафесій для жанчын быў скарочаны[11], 88 прафесій паранейшаму застаюцца недаступнымі, што абмяжоўвае іх прафесійныя магчымасці. Гендарны разрыў у заробках застаецца значным – жанчыны зарабляюць на 20–26% менш за мужчын у сярэднім. Такія практыкі парушаюць Артыкул 11 Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, які гарантуе роўныя магчымасці ў прафесійнай сферы. І хоць жанчыны фармальна маюць доступ да кіруючых пасад, у рэчаіснасці яны не ўплываюць на прыняццё рашэнняў.
18. Беларусь працягвае прымусовы прызыў на вайсковую службу для маладых мужчын. Зменамі закона[12] ад 17 мая 2023 года было скасавана права на адтэрміноўку для тых, хто вучыцца за мяжой, што прымушае іх пераносіць навучанне або рызыкаваць вяртаннем у краіну, дзе ім пагражае прызыў або пераслед.

**Рэкамендацыі**:

- Прыняць і рэалізаваць законы, што забараняюць дыскрымінацыю паводле сэксуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці, у тым ліку ў прафесійнай сферы, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі (Канвенцыяй аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах).
- Забяспечыць абарону ЛГБТК+ асоб праз спыненне мэтанакіраваных рэпрэсій, дыскрымінацыі і парушэння правоў.
- Павысіць даступнасць медыцынскіх паслуг для трансгендарных асоб шляхам спынення дыскрымінацыі і зняцця бюракратычных перашкод у працэсе гендарнага пераходу.

---

[9] Органы ўнутраных спраў зарэгістравалі каля 70 000 выпадкаў хатняга гвалту [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://belta.by/society/view/mvd-na-profilakticheskom-uchete-sostojat-okolo-14-tys-domashnih-deboshirov-536836-2022/ Дата доступу: 22.02.2025.

[10] «Маніторынг НКА ў Беларусі, якія знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі або прынялі рашэнне аб самаліквідацыі» [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.lawtrend.org/liquidation-nko Дата доступу: 20.03.2025.

[11] Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. (2022). Аб змяненні пастановы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2014 года № 35. Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22238286&p1=1&p5=0 Дата доступу: 12.02.2025.

[12] *News House. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://news.house/57965 Дата доступу: 12.02.2025.*

- Прыняць нацыянальны закон аб прадухіленні хатняга гвалту ў адпаведнасці з міжнароднымі абавязальніцтвамі.
- Аднавіць права на адукацыйную адтэрміноўку для студэнтаў, якія навучаюцца за мяжой, і распрацаваць альтэрнатыўныя, невайсковыя формы службы.

## ПРАВА НА ЗДАРОВАЕ НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ

*Рэкамендацыі, прынятыя падчас 3-га цыкла УПА: 138.83*

19. Праблемы, адзначаныя раней "Экадомам"[13] у межах папярэдняга Універсальнага перыядычнага агляду, застаюцца актуальнымі, прычым большасць рэкамендацый так і не былі выкананыя. Аднак у перыяд падрыхтоўкі дадзенай справаздачы ўзмацніліся рэпрэсіі і ліквідацыя экалагічных няўрадавых арганізацый.
20. Закон "Аб ахове навакольнага асяроддзя", зменены 17 ліпеня 2023 года, выключае інфармацыю пра дзяржаўныя рашэнні, што ўплываюць на навакольнае асяроддзе, і пра генна-мадыфікаваныя арганізмы, што азначае абмежаванне доступу да экалагічнай інфармацыі.
21. Тэрмін грамадскіх абмеркаванняў у сферы архітэктурнага і гарадскога планавання быў скарочаны з 35 да 20 дзён, што абмежавала магчымасць для паўнавартаснага ўдзелу грамадскасці. Падыход да грамадскага ўдзелу ў прыняцці рашэнняў у экалагічнай сферы быў зведзены да павярхоўных абмеркаванняў справаздач ці праектаў.
22. Страх стрымлівае грамадзян_ак ад актыўнага ўдзелу ў абмеркаваннях і кантактаў з уладамі па экалагічных пытаннях; актывісты_кі сутыкаюцца з затрыманнямі і ціскам за збор подпісаў ці ўдзел у абмеркаваннях, што падрывае прынцыпы справядлівасці паміж пакаленнямі.
23. Нягледзячы на тое, што заканадаўчыя змены цяпер прадугледжваюць магчымасць абскарджання адмовы або неналежнага прадастаўлення экалагічнай інфармацыі, шырокія рэпрэсіі і ліквідацыя экалагічных НДА істотна абмежавалі магчымасці доступу да правасуддзя.
24. 31 жніўня 2021 года арганізацыя "Экадом" была ліквідаваная. Сустрэча Бакоў Орхускай канвенцыі прызнала гэта пераследам[14] і заклікала аднавіць арганізацыю – аднак гэтыя рэкамендацыі былі праігнараваныя. Пазней "Экадом" быў прызнаны экстрэмісцкім фармаваннем, а яго вэб-сайт быў заблакаваны. Вэб-сайт і сацыяльныя сеткі экалагічнага інфармацыйнага рэсурсу greenbelrus.info таксама былі прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі.
25. 27 ліпеня 2023 года Вярхоўны Суд распусціў Партыю зялёных за непрадастаўленне спісу сваіх сябраў_овак з-за меркаванняў бяспекі. Лідар партыі

---

[13] Экадом, Сітуацыя з рэалізацыяй права на здаровае і задавальняючае асяроддзе ў Рэспубліцы Беларусь, 2019 [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://upr-info.org/sites/default/files/documents/2020-10/ecohome-_belarus_.pdf Дата доступу: 12.02.2025.

[14] Рашэнне VII/8c аб выкананні Беларуссю сваіх абавязацельстваў па Орхускай Канвенцыі [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://unece.org/sites/default/files/2021-11/Decision_VII.8c_eng.pdf Дата доступу: 12.02.2025.

Дзмітрый Кучук быў асуджаны да шасці гадоў пазбаўлення волі і прызнаны палітычным зняволеным.

26. Беларусь выйшла з Орхускай канвенцыі[15] і Бернскай канвенцыі, не выканаўшы ключавыя рэкамендацыі Камітэта па выкананні Орхускай канвенцыі і Камітэта па выкананні Канвенцыі Эспа.
27. Не было дасягнута істотнага прагрэсу ў распрацоўцы заканадаўства аб змяненні клімату або зніжэнні рызыкі стыхійных бедстваў. Асноўныя пункты Плана дзеянняў па Парыжскім пагадненні застаюцца невыкананымі, у тым ліку зацвярджэнне Стратэгіі па нізкіх выкідах да 2050 года і Плана дзеянняў па адаптацыі да змянення клімату.

**Рэкамендацыі:**

- Прывесці практыкі і заканадаўства ў сферы доступу да экалагічнай інфармацыі, грамадскага ўдзелу і правасуддзя ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі.
- Спыніць рэпрэсіі супраць экалагічных актывістаў_ак і няўрадавых арганізацый. Аднавіць рэгістрацыю ліквідаваных экалагічных НДА, у тым ліку “Экадома”. Аднавіць рэгістрацыю Беларускай партыі зялёных.
- Прымаць меры для паўторнага далучэння Беларусі да Орхускай і Бернскай канвенцый і іх выканання.
- Забяспечыць выкананне рашэнняў Сустрэч Бакоў Орхускай і Эспо канвенцый і наладзіць супрацоўніцтва з іх органамі.
- Распрацаваць Стратэгію і Нацыянальны план дзеянняў па адаптацыі да змянення клімату, забяспечыць удзел грамадскасці ў падрыхтоўцы і прыняцці Нацыянальна вызначаных ўнёскаў (NDCs) і іншых палітык па змяненні клімату.

## СВАБОДА АД КАТАВАННЯЎ І ЖОРСТКАГА, НЕЧАЛАВЕЧАГА ЦІ ПРЫНІЖАЮЧЫХ ГОДНАСЦЬ ВІДАЎ АБЫХОДЖАННЯ

*Рэкамендацыі, прынятыя падчас 3-га цыкла УПА: 138.102-138.104, 138.109, 138.128*

28. Катаванні і іншыя формы жорсткага, нечалавечага і зневажальнага абыходжання ўзмацніліся пасля масавых арыштаў удзельнікаў_ц пратэстаў, уключаючы моладзь, пасля выбараў 2020 года і яшчэ больш абвастрыліся пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну ў 2022 годзе[16]. Маладыя людзі,

---

[15] Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 247, 18 ліпеня 2022 года, «Аб выходзе Рэспублікі Беларусь з міжнароднага дагавора» [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://president.gov.by/en/events/belarus-to-withdraw-from-aarhus-convention Дата доступу: 12.02.2025.

[16] Задзіночанне беларускіх студэнтаў. (2022, 28 снежня). Справаздача Задзіночання беларускіх студэнтаў: Стан беларускай акадэміі ў 2022 годзе. Еўрапейскі студэнцкі саюз. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://esu-online.org/publications/belarusian-students-association-report-the-state-of-belarusian-academia-in-2022/ Дата доступу: 12.02.2025.

падазраваныя ў нелаяльнасці, падвяргаліся жорсткім збіваннем, псіхалагічнаму ціску і нечалавечым умовам утрымання пад вартай. Многія былыя палітычныя зняволеныя паведамляюць пра перапоўненыя камеры, адсутнасць медыцынскай дапамогі, пазбаўленне базавых умоваў гігіены і пазбаўленне сну. Прымус да прызнання віны застаецца сістэмнай практыкай: затрыманых прымушаюць прызнаваць віну шляхам фізічных і псіхалагічных катаванняў. Іх таксама прымушаюць запісваць так званыя "пакаяльныя відэа", у якіх яны прызнаюцца ў злачынствах і выказваюць лаяльнасць да ўлады.

29. 25 мая 2021 года ў Мінску 18-гадовы Дзмітрый Стахоўскі, абвінавачаны па крымінальнай справе аб удзеле ў так званых "масавых беспарадках" 9-11 жніўня 2020 года (частка 2 артыкула 293 Крымінальнага кодэкса), загінуў, скончыўшы жыццё самагубствам, скочыўшы з 16-павярховага дома. Перад смерцю ён апублікаваў развітальнае паведамленне ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте", у якім патлумачыў сваё рашэнне маральным ціскам, які аказваўся на яго падчас судовага пераследу.
30. З эміграцыяй былых студэнцкіх актывістаў_к у краіны, свабодныя ад пераследу, сталі вядомыя падрабязнасці пра ўмовы іх утрымання і выпадкі катаванняў і іншага жорсткага, нечалавечага і зневажальнага абыходжання. Амаль усе асобы, якія падвергліся палітычнаму пераследу за выказванне іншадумных меркаванняў, у тым ліку за ўдзел у мірных пратэстах, паведамляюць[17] пра катаванні і жорсткае абыходжанне: збіванні, псіхалагічны ціск, антысанітарныя ўмовы, працяглую ізаляцыю, ігнараванне патрэб у медыцынскай дапамозе і інш.
31. 30 сакавіка 2022 года былі арыштаваныя Яўген Мінкевіч, Дзмітрый Клімаў і Уладзімір Аўрамцоў. Яны падазраюцца ў знішчэнні двух рэлейных шаф каля Асіповічаў (Магілёўская вобласць) пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну. Падчас затрымання супрацоўнікі праваахоўных органаў ужывалі супраць іх агнястрэльную зброю. Пасля затрымання супрацоўнікі мэтанакіравана стралялі ім у каленныя суставы, хоць яны не аказвалі супраціву.
32. Праваабаронцы атрымалі паведамленні пра тое, што беларускамоўных затрыманых і асуджаных грамадзян_ак прымушаюць адмаўляцца ад выкарыстання беларускай мовы праз здзекі, абразы, збіванні і сістэматычны ціск. Акрамя таго, улады адмаўляюць у апрацоўцы карэспандэнцыі на беларускай мове і ў медыцынскай дапамозе, што яшчэ больш пагаршае іх становішча і парушае іх правы чалавека. Такія дзеянні таксама кваліфікуюцца як катаванні і жорсткае абыходжанне, парушаючы свабоду ад катаванняў.

**Рэкамендацыі:**

- Ініцыяваць эфектыўныя, празрыстыя і незалежныя расследаванні парушэнняў правоў чалавека, якія ўтвараюць злачынствы паводле нацыянальнага або

[17] Шанахан, М. (2021, 30 жніўня). Беларускія студэнты вымушаны ўцякаць, пакуль актывістаў катуюць і заключаюць у турму. Honi Soit. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://honisoit.com/2021/08/belarusian-students-forced-to-flee-as-activists-tortured-imprisoned/ Дата доступу: 12.02.2025.

міжнароднага права, у тым ліку, але не абмяжоўваючыся катаваннямі і іншымі формамі жорсткага абыходжання. Забяспечыць, каб расследаванні ахоплівалі ўсю вертыкаль прыняцця рашэнняў, прыцягваючы да адказнасці ўсіх асоб, якія могуць несці крымінальную адказнасць.

- Гарантаваць кожнаму_ай права на свабоду ад катаванняў, жорсткага, нечалавечага і зневажальнага абыходжання. Спыніць выкарыстанне катаванняў, жорсткага, нечалавечага і зневажальнага абыходжання ў дачыненні да асоб у месцах пазбаўлення волі, уключаючы спыненне практыкі прымусовых прызнанняў віны, запісу "пакаяльных відэа" і фізічнага ці псіхалагічнага гвалту ў сувязі з палітычнымі перакананнямі.
- Забяспечыць поўнае і ўсебаковае кампенсаванне шкоды ўсім ахвярам парушэнняў правоў чалавека ў адпаведнасці з міжнароднымі і нацыянальнымі прававымі стандартамі. Такая кампенсацыя павінна ўключаць кампенсацыю шкоды, рэстытуцыю, рэабілітацыю, адпаведныя меры для аднаўлення справядлівасці і гарантыі прадухілення паўтору.
- Уключыць нормы аб забароне катаванняў у нацыянальнае заканадаўства з мэтай прадухілення будучых парушэнняў і забеспячэння выканання міжнародных абавязальніцтваў у галіне правоў чалавека, асабліва тых, што выцякаюць з Канвенцыі супраць катаванняў.

## СВАБОДА ВЫКАЗВАННЯ МЕРКАВАННЯЎ І ПАЛІТЫЧНЫ ЎДЗЕЛ

*Рэкамендацыі, прынятыя Беларуссю падчас 3-га цыкла УПА: 138.141-138.143, 138.145-138.146, 138.176-138.179, 138.183, 138.193, 138.212*

33. У перыяд з 2020 па 2025 год урад Беларусі сістэматычна накіроўваў свае дзеянні супраць асоб і груп, якія выказвалі іншадумныя або альтэрнатыўныя меркаванні, выкарыстоўваючы абмежавальнае заканадаўства і карныя меры. Змены ў Закон “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму”[18] і Адміністрацыйны кодэкс[19] увялі крымінальную адказнасць за судзеянне і навучанне экстрэмісцкай дзейнасці, абразу або дыскрэдытацыю органаў улады, распаўсюджванне ілжывай інфармацыі пра Беларусь, парушэнне правілаў арганізацыі масавых мерапрыемстваў, незаконную дзейнасць са зброяй у экстрэмісцкіх мэтах, а таксама злачынствы супраць грамадскага парадку або маральнасці, учыненыя з экстрэмісцкім намерам. Гэтыя змяненні дазваляюць уладам пазначаць іншадумства як экстрэмізм, што адкрывае шырокія магчымасці для пераследу і парушае права на свабоду выказвання меркаванняў, замацаванае ў Артыкуле 19

---

[18]Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. Закон Рэспублікі Беларусь: Аб змяненнях у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=h10700203 Дата доступу: 12.02.2025.

[19] Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. Закон Рэспублікі Беларусь: Аб увядзенні змяненняў у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=HK2100091 Дата доступу: 12.02.2025.

Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, абмяжоўваючы магчымасць вольнага выказвання меркаванняў без страху перад пераследам. Такім чынам, за разгледжаны перыяд больш за 3000 інтэрнэт-рэсурсаў, груп у сацыяльных сетках, малюнкаў, песень, кніг і стыкерпакаў у мэсэнджарах былі прызнаныя "экстрэмісцкімі матэрыяламі", прычым пераважная большасць гэтых матэрыялаў належыць незалежным медыя або прадэмакратычнаму кантэнту. Гэта прывяло да таго, што больш за 6000 асоб былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці за распаўсюджванне або валоданне такімі матэрыяламі, пры гэтым праверкі электронных прылад на мяжы сталі выкарыстоўвацца ўсё часцей. Многія з пацярпелых былі падвергнутыя адміністрацыйнаму арышту тэрмінам да 30 сутак, часта з пагрозамі і фізічным запалохваннем. Асабліва моцна былі закранутыя студэнты_кі і моладзь: ВНУ супрацоўнічалі з дзяржаўнымі структурамі для выяўлення і пакарання ўдзельнікаў_ц пратэстаў або распаўсюджвальнікаў_ц іншадумных поглядаў у інтэрнэце.

34. Магчымасць функцыянавання апазіцыйных партый і іх моладзевых крылаў была сістэматычна знішчаная праз юрыдычныя, адміністрацыйныя і самавольныя меры. Змены 2021 года ў Закон "Аб палітычных партыях"[20] павысілі парог колькасці сяброў_вак для рэгістрацыі з 1000 да 5000 асоб, увёўшы дадатковыя патрабаванні па паўторнай рэгістрацыі, што прывяло да ліквідацыі 12 з 16 партый, пакінуўшы толькі праўладныя структуры. Моладзевыя крылы ліквідаваных партый былі забароненыя, а іх чальцы_іні падвергліся пераследу за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый. Больш за 200 апазіцыйных груп былі прызнаныя "экстрэмісцкімі", што прывяло да крыміналізацыі іх дзейнасці і прымусіла многіх маладых актывістаў_ак да эміграцыі або дзейнасці ў падполлі. Чальцы_іні такіх груп сутыкаюцца з пастаянным наглядам, затрыманнямі і турэмнымі тэрмінамі, што эфектыўна прыгнятае моладзевую актыўнасць і абмяжоўвае доступ да магчымасцяў выказвання сваіх патрэб, меркаванняў і пазіцый.

35. Выбарчыя працэсы апошніх пяці гадоў, уключаючы парламенцкія выбары 2024 года і прэзідэнцкія выбары 2025 года, былі характарызаваныя шырокімі парушэннямі і прымусам. Незалежныя назіральнікі_цы і праваабарончыя арганізацыі адзначаюць масавыя фальсіфікацыі, абмежаванне доступу незалежных назіральнікаў_ц і выключэнне апазіцыйных кандыдатаў_к. Установы адукацыі выкарыстоўваліся для палітычнага кантролю: студэнтаў_к прымушалі галасаваць за праўладных кандыдатаў_к, удзельнічаць у дзяржаўных мітынгах і прапагандысцкіх мерапрыемствах пад пагрозай адлічэння або іншых санкцый. Юрыдычныя абмежаванні яшчэ больш падарвалі выбарчыя правы: мінімальны ўзрост кандыдата_кі на пасаду прэзідэнта быў павышаны да 40 гадоў, уведзена патрабаванне 20-гадовага бесперапыннага пражывання ў Беларусі без

[20] Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: Аб мерах па рэалізацыі Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=v19403266 Дата доступу: 12.02.2025.

грамадзянства або віду на жыхарства ў іншай дзяржаве. Актыўнае выбарчае права дагэтуль недаступнае для недзеяздольных асоб, зняволеных і грамадзян_ак, якія знаходзяцца ў выгнанні з-за палітычнага пераследу, без магчымасці галасавання за мяжой. Гэтыя меры падрываюць сумленнасць выбарчага працэсу і пазбаўляюць моладзь магчымасці ўплываць на сваю палітычную будучыню.

36. Артыкул 5.18.1 Кодэкса аб адукацыі дазваляе адлічэнне студэнтаў_к за любую форму адміністрацыйнай адказнасці, нават калі яна не звязаная з вучэбным працэсам. Гэтае палажэнне часта выкарыстоўваецца супраць студэнтаў_к, затрыманых за мірнае выказванне сваіх поглядаў. Выкарыстанне адлічэння як інструмента палітычнага пераследу можа быць прызнана дыскрымінацыяй паводле Артыкула 1 Канвенцыі ЮНЕСКА аб барацьбе з дыскрымінацыяй у галіне адукацыі, а таксама Артыкула 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які абараняе свабоду выказвання меркаванняў.
37. Артыкул 186 новай рэдакцыі Кодэкса аб культуры[21] забараняе незалежным экскурсаводам_кам праводзіць экскурсіі па музеях, надаючы такое права выключна штатным супрацоўнікам_цам музеяў. Гэта абмяжоўвае магчымасці незалежных даследчыкаў_ц, гісторыкаў_арынь і экскурсаводаў_чыц прадстаўляць альтэрнатыўныя гістарычныя погляды, яшчэ больш абмяжоўваючы свабоду выказвання меркаванняў і доступ грамадскасці да разнастайных гістарычных наратываў.

**Рэкамендацыі**:

- Унесці змены ў Закон “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму”, Адміністрацыйны і Крымінальны кодэксы, а таксама ў іншыя звязаныя законы для дакладнага вызначэння паняцця “экстрэмізм” у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека. Забяспечыць празрыстасць і судовую праверку класіфікацыі матэрыялаў як экстрэмісцкіх і не дапускаць неабгрунтаванага абмежавання незалежных СМІ або грамадзянскай супольнасці.
- Перагледзець змены 2021 года ў Закон “Аб палітычных партыях”, аднавіць прававы статус ліквідаваных партый і іх моладзевых крылаў і стварыць умовы для плюралістычнага палітычнага асяроддзя.
- Стварыць незалежную выбарчую камісію для забеспячэння свабодных і справядлівых выбараў з удзелам нацыянальных і міжнародных назіральнікаў_ц. Забараніць выкарыстанне ўстаноў адукацыі для палітычнага прымусу і забяспечыць свабоду выбару. Рэфармаваць выбарчае заканадаўства для абароны правоў назіральнікаў_ц, асоб з інваліднасцю, зняволеных і грамадзян_ак за мяжой.
- Унесці змены ў Кодэкс аб адукацыі, каб выключэнні студэнтаў_ак адбываліся толькі на падставе навучальнай паспяховасці або парушэнняў, звязаных з адукацыйным працэсам.

---

[21] Беларусь. Кодэкс аб культуры [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413 Дата доступу: 22.03.2025.

- Адмяніць артыкул 186 новага Кодэкса аб культуры, дазволіўшы незалежным экскурсаводам_чыцам, даследчыкам_цам і гісторыкам_арыням праводзіць музейныя экскурсіі, забяспечваючы свабоду выказвання меркаванняў і доступ грамадскасці да разнастайных гістарычных поглядаў.

## ПРАВА НА СПРАВЯДЛІВЫ СУД

38. З 2020 года тысячы беларусаў_ак, у тым ліку моладзь, былі адвольна арыштаваныя і затрыманыя па палітычных матывах. Гэтыя асобы былі арыштаваныя і затрыманыя за рэалізацыю сваіх фундаментальных правоў на свабоду выказвання меркаванняў, свабоду асацыяцый і мірных сходаў, аднак ім было адмоўлена ў праве на справядлівы суд.
39. За 4,5 года пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года 6824 асобы былі асуджаныя па палітычна матываваных крымінальных справах. Амаль усе яны былі прызнаныя палітычнымі зняволенымі, і каля 35% з іх складалі маладыя людзі, уключаючы не менш за 77 студэнтаў_ак. Сярод іх былі 11 студэнтаў_ак, затрыманых 12 лістапада 2020 года і пазней асуджаных на 2 і 2,5 гады пазбаўлення волі. Маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў былі абвінавачаныя ў арганізацыі пратэстаў у сваіх універсітэтах. Усе яны былі прызнаныя палітычнымі зняволенымі[22].
40. Крымінальныя судовыя працэсы праводзіліся з шматлікімі парушэннямі правоў на належную прававую працэдуру і права на справядлівы суд. Адвакаты_кі сутыкаліся з істотнымі перашкодамі ў доступе да сваіх кліентаў_к, а падсудныя былі пазбаўленыя права на канфідэнцыяльную сувязь са сваімі юрыдычнымі прадстаўнікамі_цамі. Акрамя таго, адвакатам_кам было абмежавана права належным чынам азнаёміцца з матэрыяламі спраў і прадугледжана недастатковая колькасць часу для вывучэння доказаў і падрыхтоўкі эфектыўнай абароны.
41. У некаторых выпадках арышты маладых людзей па палітычных матывах прызнаваліся адвольнымі, у тым ліку выпадак маладой праваабаронкі Марфы Рабковай. Яе судзілі ў закрытым рэжыме пры ціску на адвакатаў_к. Яна была неправамерна асуджаная на 14,9 года пазбаўлення волі і абвешчаная тэрарысткай[23].
42. Акрамя адвольнасці некаторых затрыманняў, яны часта ажыццяўляліся з празмерным ужываннем фізічнай сілы. Гвалт таксама прымяняўся да затрыманых у месцах пазбаўлення волі і падчас допытаў. Маладая праваабаронка Настасся Лойка паведаміла падчас судовага пасяджэння, што пасля затрымання і падчас утрымання пад вартай яна падвяргалася катаванням і жорсткаму абыходжанню, у тым ліку праз ужыванне электрашокера з боку супрацоўнікаў праваахоўных

[22] Scholars at Risk. (2022, 20 лістапада). Справа студэнтаў, Беларусь. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.scholarsatrisk.org/actions/student-case-belarus/ Дата доступу: 22.03.2025.

[23] Праваабарончы цэнтр «Вясна». (б. д.). Марфа Рабкова – Палітычныя зняволеныя ў Беларусі. Праваабарончы цэнтр «Вясна». [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://prisoners.spring96.org/en/person/marfa-rabkova Дата доступу: 22.03.2025.

органаў. Яна была неправамерна асуджаная на 7 гадоў пазбаўлення волі за нібыта распальванне сацыяльнай варожасці.

43. Права на справядлівы суд таксама парушалася ў адміністрацыйных працэсах. Акрамя істотных перашкод у доступе да юрыдычных прадстаўнікоў, падсудныя часта не атрымлівалі належнай інфармацыі пра прычыны свайго затрымання. Акрамя таго, сведкі абвінавачання часта давалі паказанні ананімна праз Skype, што падрывала прынцыпы празрыстасці і права на справядлівы суд. Суды таксама ігнаравалі факты і матэрыялы, што сведчылі пра непаслядоўнасці ў абгрунтаванні затрымання абвінавачаных.
44. Практыка правядзення паказальных судоў ва ўстановах, што фінансуюцца за кошт дзяржаўных сродкаў, асабліва ва ўніверсітэтах, выклікае занепакоенасць адносна далейшых парушэнняў права на справядлівы суд. У чэрвені 2024 года выязное судовае пасяджэнне на юрыдычным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы прысудзіла палітзняволеных Дар'ю Заяц і Валерыю Драгун да аднаго года пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі па артыкуле 370 Крымінальнага кодэкса. Гэты працэс дэманстраваў строгія пакаранні за іншадумства і рост практыкі публічных судоў ва ўніверсітэтах, ваенкаматах і школах. Такія працэсы служаць не толькі формай судовага пераследу, але і сродкам публічнага прыніжэння і запалохвання.
45. Адсутнасць належнай падрыхтоўкі суддзяў для вядзення працэсаў на беларускай мове фактычна робіць немагчымым забеспячэнне правасуддзя на ёй. Нягледзячы на тое, што заканадаўства тэарэтычна дазваляе выкарыстанне беларускай мовы ў судах, на практыцы грамадзянам_кам часта адмаўляюць у такой магчымасці, што яшчэ больш абмяжоўвае іх моўныя правы ў судовай сістэме.

**Рэкамендацыі:**

- Вызваліць усіх асоб, асуджаных па палітычных матывах, і аднавіць іх грамадзянскія, палітычныя і акадэмічныя правы.
- Забяспечыць права на справядлівы суд для ўсіх абвінавачаных без дыскрымінацыі на падставе палітычных поглядаў.
- Спыніць сістэматычнае ўзбуджэнне крымінальных і адміністрацыйных спраў на палітычна матываванай падставе.
- Забяспечыць належныя прававыя гарантыі і эфектыўныя сродкі прававой абароны супраць адвольных затрыманняў.
- Увесці ясныя працэсуальныя гарантыі для забеспячэння права грамадзян_ак абіраць беларускую мову для вядзення судовых працэсаў.

## СВАБОДА АСАЦЫЯЦЫЙ

*Рэкамендацыі, прынятыя Беларуссю падчас 3-га цыкла УПА: 138.59, 138.60, 138.62, 138.64, 138.184*

46. Незалежныя асацыяцыі і няўрадавыя арганізацыі сутыкнуліся з беспрэцэдэнтнай хваляй ліквідацый, адвольным і непрапарцыйным пераследам на падставе зменаў у заканадаўстве, уключаючы вяртанне прынцыпу дазволу на правядзенне масавых мерапрыемстваў, крыміналізацыю дзейнасці ад імя нерэгістраванай арганізацыі, а таксама павелічэнне пакарання за “дзеянні ад імя экстрэмісцкага фарміравання”.
47. Больш за 200 арганізацый, у тым ліку Беларускі нацыянальны моладзевы савет “РАДА”[24] і шматлікія яго сяброўскія арганізацыі, былі прызнаныя або “экстрэмісцкімі”, або “тэрарыстычнымі” фарміраваннямі, што падвергла іх сябраў_овак сур’ёзнай крымінальнай адказнасці. У некаторых выпадках нават асобы, якія вымушана пакінулі краіну, былі падвергнутыя завочным судам і асуджаныя на доўгія тэрміны пазбаўлення волі за аналітычную або навуковую працу. Дзейнасць грамадзянскай супольнасці была паралізаваная: актывісты_кі сутыкаюцца з назіраннем, пераследам і арыштамі. Акрамя таго, адміністрацыйныя перашкоды і адвольныя юрыдычныя інтэрпрэтацыі зрабілі амаль немагчымай дзейнасць новых і існуючых аб’яднанняў.
48. У 2021 годзе сацыяльныя сеткі дзевяці незалежных студэнцкіх саюзаў найбуйнейшых дзяржаўных універсітэтаў Беларусі былі прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі. Гэтыя арганізацыі былі створаныя ў 2020 годзе на хвалі пратэстаў для мабілізацыі мірных дэманстрацый, каардынацыі дзеянняў салідарнасці і падтрымкі студэнцкага актывізму. З цягам часу яны сталі важнай крыніцай інфармацыі, інфармуючы пра пратэсты, правы студэнтаў і акадэмічныя свабоды.
49. У перыяд з 2021 па 2024 год былі прымусова ліквідаваныя 1180 няўрадавых арганізацый[25], часта праз правядзенне ператрусаў, канфіскацыю маёмасці і кампаніі дыскрэдытацыі, скіраваныя на знішчэнне грамадзянскай актыўнасці. Людзі ўнутры краіны пазбягаюць далучэння да арганізацый, што дзейнічаюць з-за мяжы, з-за рызыкі пераследу. Шматлікія актывісты_кі, якія працягвалі сваю дзейнасць, былі вымушаныя пакінуць краіну, асабліва пасля пратэстаў 2022 года і падчас перадвыбарчых хваль рэпрэсій.

---

[24] Праваабарончы цэнтр «Вясна». (2025, 10 студзеня). У 2024 годзе 89 арганізацый былі прызнаныя «экстрэмісцкімі фармаваннямі», у тым ліку медыя, тэатральная трупа і грамадскія арганізацыі. Праваабарончы цэнтр «Вясна». [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://spring96.org/en/news/117124 Дата доступу: 22.03.2025.

[25] Lawtrend. (2024, снежань). НКА ў Беларусі [PDF]. Lawtrend. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.lawtrend.org/wp-content/uploads/2024/12/NKO-V-BELARUSI.pdf Дата доступу: 22.03.2025.

**Рэкамендацыі**:

- Адмяніць крымінальную адказнасць за дзейнасць незарэгістраваных арганізацый і аднавіць спрошчаны працэс рэгістрацыі НДА.
- Стварыць незалежны механізм маніторынга для прадухілення адвольных ліквідацый НДА і забеспячэння адпаведнасці стандартам у галіне правоў чалавека.

## САЦЫЯЛЬНЫЯ І ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАВЫ

*Рэкамендацыі, прынятыя Беларуссю падчас 3-га цыкла УПА: 138.219-138.221, 138.223-138.224, 138.78-138.82, 138.225*

50. Пасля выбараў 2020 года тысячы спецыялістаў_к былі звольненыя за ўдзел у мірных пратэстах і забастоўках. Гэтыя звальненні закранулі як дзяржаўны, так і прыватны сектар, дзе працадаўцы сутыкаліся з ціскам з мэтай ачысткі працоўных калектываў ад іншадумцаў. Паводле паведамленняў, палітычная лаяльнасць стала крытэрыем пры найме на працу: Камітэт дзяржаўнай бяспекі правяраў кандыдатаў_к на наяўнасць адміністрацыйных або крымінальных справаў у мінулым. Дыскрымінацыя ў сферы занятасці стала сістэмнай: лаяльнасць уплывала на прыняцце на працу і павышэнне на пасадзе. Чорныя спісы былі асабліва распаўсюджаныя ў “адчувальных” сектарах, такіх як дзяржаўнае кіраванне, медыя, адукацыя, а таксама ў больш “нейтральных” сектарах.
51. Малы і сярэдні бізнес сутыкнуўся з пераследам за падтрымку пратэстаў 2020–2021 гадоў. Прадпрыемствы, якія ўдзельнічалі ў страйках або выказвалі салідарнасць з пратэстуючымі, падвяргаліся сур’ёзным наступствам, уключаючы ануляванне ліцэнзій, адвольныя праверкі і прымусовае закрыццё. Эканамічны ціск і пераслед сталі інструментамі палітычных рэпрэсій. Напрыклад, кандыдат у прэзідэнты Віктар Бабарыка і яго сын Эдуард былі затрыманыя пад абвінавачаннямі ў эканамічных злачынствах. У Мінску дзейнічала неафіцыйная трохгадовая забарона на рэгістрацыю індывідуальных прадпрымальнікаў: бізнесы пазначаліся як “недобрасумленныя” або “непатрыятычныя”. У канцы 2024 года забарону адмянілі, але спектр дазволеных відаў дзейнасці быў істотна скарочаны.
52. Студэнты_кі, якія атрымоўваюць дзяржаўную адукацыю за кошт бюджэту, вымушаныя прымаць працоўнае размеркаванне тэрмінам на 2–5 гадоў[26], што супярэчыць не толькі Канстытуцыі краіны, але і міжнародным абавязальніцтвам Беларусі. У разгледжаны перыяд урад узмацніў абмежаванні, забараніўшы дыстанцыйную і частковую занятасць і прымусіўшы ўніверсітэты

[26] Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. (2022, студзень). Закон аб змяненнях у Кодэкс аб адукацыі [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://adu.by/images/2022/01/zakon-ob-izmen-kodeksa-ob-obrazovanii.pdf Дата доступу: 12.02.2025.

дыскрымінаваць іншадумцаў. Актывістка Анастасія Махамет была размеркавана з Мінска ў Магілёў у абыход дзеючых прававых нормаў. Шматлікія выпускнікі_цы выкарыстоўвалі фіктыўныя шлюбы, неафіцыйную занятасць або былі вымушаныя эміграваць, каб пазбегнуць выканання абавязацельстваў, часта сутыкаючыся з фінансавымі санкцыямі. Такая палітыка, якая парушае Артыкул 6 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, перашкаджае прафесійнаму росту і свабодзе выбару занятасці, пакідаючы маладых спецыялістаў_к у нестабільным становішчы.

**Рэкамендацыі:**

- Унесці змены ў заканадаўства аб працы, каб яўна забараніць дыскрымінацыю пры прыёме на працу, звальненні і прасоўванні па службе на падставе палітычнай дзейнасці або перакананняў. Стварыць незалежны механізм нагляду для расследавання скаргаў, скасавання чорных спісаў супрацоўнікаў_ц і спынення кантролю з боку Камітэта дзяржаўнай бяспекі за працоўнымі рашэннямі.
- Рэалізаваць празрысты рэгулятарны механізм для прадухілення адвольных праверак, рэйдаў і стыгматызацыі. Аднавіць поўны спектр відаў дзейнасці для індывідуальных прадпрымальнікаў_ц.
- Унесці змены ў Кодэкс аб адукацыі такім чынам, каб абавязковае размеркаванне прымянялася толькі да выразна вызначаных "сацыяльна значных прафесій". Забяспечыць празрыстасць працэдур размеркавання, дазволіць выпускнікам_цам адмаўляцца ад размеркавання без прымянення санкцый і прадугледзець магчымасць дыстанцыйнай або частковай занятасці для адпаведнасці міжнародным працоўным стандартам і справядлівым падыходам.

## МОЎНЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ ПРАВЫ

53. Згодна з Артыкулам 27 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і Артыкулам 2 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, кожны чалавек мае права карыстацца сваёй роднай мовай без дыскрымінацыі. Аднак у Беларусі сістэматычная дыскрымінацыя беларускамоўных грамадзян_ак захоўваецца ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.
54. Станам на 10 верасня 2021 года ў даведачнай базе даных утрымлівалася 195 130 нарматыўных прававых актаў, з якіх толькі 2 729 (1,4%) былі даступныя на беларускай мове. З 25 кодэксаў толькі 16 былі перакладзеныя на беларускую мову. Гэта не толькі абмяжоўвае доступ беларускамоўных грамадзян_ак да прававой інфармацыі, але і абмяжоўвае магчымасць выкарыстання беларускай мовы пры ажыццяўленні грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў. Напрыклад, большасць падатковых формаў, формаў рэгістрацыі юрыдычных асоб і іншых афіцыйных дакументаў зацверджаныя толькі на рускай мове.

55. Паводле звестак праваабаронцаў, многія палітычныя зняволеныя пазбаўленыя доступу да адукацыі, бібліятэк, спартыўных аб’ектаў і культурных мерапрыемстваў. У месцах пазбаўлення волі сучасныя кнігі на беларускай мове часта недаступныя, у той час як рускамоўная літаратура застаецца даступнай. Асабліва грубае парушэнне мела месца ў папраўчай калоніі №15 у Магілёве ў верасні 2024 года, калі па загадзе адміністрацыі была спалена большая частка беларускамоўных кніг.
56. Дзяржаўная ўвага і фінансаванне ў асноўным накіроўваюцца на гістарычныя і культурныя аб’екты, прызнаныя спадчынай міжнароднага або рэспубліканскага значэння, а таксама на помнікі Другой сусветнай вайны. У той жа час мясцовыя помнікі, нават афіцыйна ўключаныя ў спісы, не атрымліваюць належнага догляду і часта знаходзяцца ў занядбаным стане з-за бяздзеяння дзяржавы або наўмыснага знішчэння. Многія аб’екты гістарычнай спадчыны застаюцца без дастатковага фінансавання і знаходзяцца ў крытычным стане.
57. Асаблівую занепакоенасць выклікае мэтанакіраванае разбурэнне Чырвонага касцёла ў Мінску. Пасля палітычных пратэстаў улады закрылі касцёл для католікаў_чак 26 верасня 2022 года, спасылаючыся на сфальсіфікаваныя занепакоенасці адносна яго стану. Касцёл быў абвешчаны аварыйным і вымагаючым тэрміновай рэстаўрацыі, аднак за больш чым 2,5 года ніводныя работы па рамонце не былі праведзеныя. У выніку менавіта адсутнасць рамонтных работ пагражае ператварыць будынак у сапраўды аварыйную канструкцыю.
58. Новая рэдакцыя Кодэкса аб культуры яшчэ больш аслабіла абарону культурнай спадчыны. Была скасаваная норма аб грамадскіх камісіях па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей, што сведчыць пра пагаршэнне адносін паміж дзяржавай і грамадствам і нежаданне ўладаў весці дыялог адносна захавання культурнай спадчыны.
59. Сістэматычнае знявагу і знішчэнне гісторыка-культурнай спадчыны, звязанай з польскай нацыянальнай меншасцю ў Беларусі, ажыццяўляецца альбо непасрэдна дзяржавай, альбо пры яе садзейнічанні, паколькі за такія дзеянні не надыходзіць пакаранне. Гэта ўключае знішчэнне магіл і помнікаў, прысвечаных жаўнерам Арміі Краёвай, паўстанню 1863 года і рэпрэсаваным у Катыні і Курапатах. У шэрагу выпадкаў вандалізму папярэднічалі абразлівыя прапагандысцкія артыкулы ў дзяржаўных СМІ, што яшчэ больш падштурхоўвала варожасць да польскай культурнай спадчыны.
60. Выкарыстанне і нават валоданне гістарычнымі нацыянальнымі сімваламі Беларусі – бел-чырвона-белым сцягам і гербам "Пагоня" – забаронена і крымінальна пераследуецца. Пры гэтым герб "Пагоня" афіцыйна ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, што падкрэслівае супярэчнасць паміж дзяржаўнай палітыкай і яе ўласнай прававой базай у сферы культурнай спадчыны.

**Рэкамендацыі:**

- Забяспечыць пераклад існуючых нарматыўных прававых актаў на беларускую мову для гарантавання роўнага доступу да прававой інфармацыі на абедзвюх дзяржаўных мовах.
- Унесці змены ў Закон аб мовах, замяніўшы існуючы факультатыўны падыход абавязковым патрабаваннем да выкарыстання абедзвюх дзяржаўных моў. У прыватнасці, маркіроўка тавараў (артыкул 30) і афіцыйныя пераклады міжнародных дагавораў (артыкул 19) павінны забяспечвацца як на беларускай, так і на рускай мовах, а не выбарачна.
- Забяспечыць раўнамернае размеркаванне дзяржаўнага фінансавання на захаванне і догляд усіх гістарычных і культурных аб’ектаў, у тым ліку мясцовых помнікаў, каб прадухіліць іх занядбанне і знішчэнне, у тым ліку помнікаў нацыянальных меншасцяў.
- Паскорыць рэстаўрацыю Чырвонага касцёла і/або аднавіць каталіцкія службы ў яго памяшканні.
- Спыніць крымінальны пераслед за выкарыстанне або дэманстрацыю герба "Пагоня".